ДА ЮБІЛЕЮ КАЛЕГІ



Тамара МАЗУР

# У адзіноце з мараю

Лірыка розных гадоў

## Выпрабаванні

Не жартую ў адзіноце з мараю,
Не імкнуся больш кагось мірыць.
Калі дужы робіцца ахвяраю,
Мабыць, праўда, белы свет гарыць.

Як душа спрабуе апантана
Самастойна вынесці свой груз.
Мабыць так, што нам наканавана
Перажыць вялікі страшны суд.

Белы свет... О, белы свет жыццёвы!..
Белы час... О, белы час людскі!
Пагублялі ласкі шчырай словы,
Не чакаю помачы рукі.

Разумею, добра разумею:
Час выносіць стойкасць на павер.
Я ва ўсім сама сабе — надзея,
Я ва ўсім сама сабе — давер.

І малюся: абміне хай гора,
І баюся — не расці, мой грэх...
Слёз сваіх нявысушаных мора
Прапускаю праз ручай уцех.

## У горад

**Так яго чытала думкі**
**Па вачах і твары.**
**Адбірала праўду ў клункі,**
**А на сметнік — чары.**

**Варажыла ў неспакоі,**
**Як бабка — на двое:**
**Быць, не быць мне гарадскою,**
**Быць, не быць з табою.**

**Дзе хамут, а дзе падкова,**
**Дзе цапок, дзе цацка?**
**Што абраць безпамылкова —**
**Багацце ці ласку?**

**Што лепей? — пытала ў зоркі,**
**— Слаўнай быць ці любай?**
**Чырванела на пагорку**
**Рабіначка-згуба.**

**Правяла матуля-вёска**
**Дзяўчо ад парога:**
**Не ласкавай, то хоць лёгкай**
**Сцелецца дарога.**

# Твая жанчына

**Кароткі ўзрост ды доўгі лёс**
**У шматпакутных нашых душаў.**
**Ты з неба зоркі мне прынёс**
**На персоленую сушу.**

**Трымаю ў прыгаршчах я іх,**
**І ззяюць казачнасцю косы.**
**У словах мудрасці тваіх**
**Як дзеўчанём гуляю босым.**

**У словах сталасці лаўлю**
**І водар руж, і прысмак кміну.**
**І ні аб чым больш не малю,**
**Калі і так – Твая Жанчына.**

## Запавет сыну

**Не прадаць, не зганьбіць, не пакінуць
Роднае і крэўнае ў бядзе.
Запавет такі рыхтую сыну,
Каб у згодзе жыў сярод людзей.
Мала выпадковую падкову
Над дзвярыма новымі прыбіць.
І зусім, мой сын, недастаткова
Не згубіць, не ўкрасці, не ўгнявіць.
Мала не судзіць, не спакушацца,
Не манахі шчаснымі былі.
Так патрэбна вольным называцца
На святой ад прадзедаў зямлі.
Так патрэбна мець яе кавалак,
З белай назвай свята й чысціні.
І, напэўна, мала, вельмі мала
Быць як вершнік горды на кані.
Насамрэч жа ні сцягі, ні зоркі
Не гартуюць гэтак пачуццё,
Як да родных нівaў і ўзгоркаў
Хіліцца пяшчотаю жыццё.
Бласлаўляю ў шлях цябе складаны,
Дзе лаўровы не дадуць вянок.
І не ён збаўляе ад заганаў,
Іншы табе трэба, мой сынок.
Той, які каханая жанчына
Жартам пакладзе на валасы.
Мой ты любы, мой ты родны сыне,
Для цябе – Радзімы галасы.
Мала на руках не мець аковаў.
Што з той волі, як душа маўчыць?
Трэба роднай, спадчыннаю мовай,
Як бясцэнным дарам даражыць.
Больш жадаць нічога не бяруся.
Многа – без граху і без спакус,
Мала нарадзіцца беларусам,
Неабходна ЖЫЦЬ як БЕЛАРУС.**

# Да роднай мовы

**Да роднай мовы як да Бога –**
**і гэта ўжо не навіна.**
**Ідзі туды сваёй дарогай,**
**ідзі… Адна?**

**О, Божа! Мова стала мэтай,**
**штрыхом на белым палатне,**
**наканаваннем і сакрэтам,**
**што выпрабоўваюць мяне.**

**О, Божа! Гэтая дарога –**
**святая памяць землякоў.**
**Аб камяні збіваю ногі,**
**і рада, што няма акоў.**

**Я чую ціхі голас продкаў**
**праз пласт стагоддзяў і масты:**
**– Да роднай мовы аднагодкаў**
**яшчэ вярнуць паспееш ты.**

**Яшчэ раскажаш праўду дзецям,**
**як болем пішаш кожны верш…**
**Прыблудаў больш і больш на свеце,**
**а беларусаў менш і менш.**

# Амбіцыі

**Ах, які камплімент:**
**"Патушыце  амбіцыі! "**
**Можа, лепей наогул**
**іх  мне болей не мець?**
**Не імкнуся даўно**
**быць Тамарай царыцаю,**
**але стаць Папялушкай —**
**значыць, больш не гарэць.**

**Ёсць амбіцыі — значыць**
**справа добрая знойдзена,**
**Адчуваю ўсе колеры**
**залатога жыцця.**
**Без амбіцый навошта**
**ўсё, што пройдзена, зроблена.**
**Без амбіцый не можа**
**быць далей  развіцця.**

**Ах, амбіцыі! Колькі**
**ў гэтым слове малюнкаў!**
**І хіба не для колераў**
**нам прызначана  жыць?**
**Не цягаю з сабою я**
**нафталінавых клункаў,**
**І не стаўлю пытанне:**
**быць мне альбо не быць?**

**Ёсць амбіцыі — значыць,**
**і надзеі, і мэты.**
**Усміхаецца сонца**
**ды  бруіцца ручай.**
**А ў душы не згасае**
**матыльковае лета,**
**Бо душа — тое месца,**
**дзе сілкуецца рай.**

*26.10.2023*

## За талент

**За талент палюбіце чалавека,**
**Адораны ён ім невыпадкова.**
**І так было не ўчора, а спрадвеку,**
**– Таленавіты права меў на слова.**

**Рамеснікаў без таленту багата**
**Сярод хацінаў і апартаментаў.**
**Але між іх заўжды былі – для свята**
**І захаплення людзі-дыяменты.**

**Без іх наш свет здаваўся б надта шэры,**
**Без іх заўсёды не хапала б фарбаў.**
**Без талентаў ніхто б ужо не верыў,**
**Што ёсць духоўныя на свеце скарбы.**

***

**Не займайце  падманам сэрцы,**
**Не давайце пустых надзей,**
**Не займайце чужыя месцы**
**Асабліва сярод людзей.**

**На пасадах і працах розных,**
**Там, дзе іншым за шчасце быць.**
**Не займайце, бо ў свеце кожны**
**Мае права такое — жыць.**

**Права жыць не якім ізгоем,**
**Не рачулкай без берагоў,**
**З-за таго, што камусьці чужое**
**Падалося смачней свайго.**

**Не займайце, сыйдзіце ціха,**
**Праўкі зробіце на палях.**
**Адвядзе вас анёл ад ліха,**
**Калі знойдзеце ўласны шлях.**

**Там, дзе творчасць — патрэбен талент,**
**Дзе каханне — яно ўзамен,**
**І любоў  — без умоў, абставін,**
**А дзе вольнасць — ніякіх сцен.**

**Не займайце чужыя месцы,**
**Колькі б вам не было гадоў.**
**Не займайце падманам сэрцы,**
**Кожнай птушцы — сваё гняздо.**

*09.08.2024*

# Пра карысць ад адзіноты

**Часам адзінота – лепшы сябар:**
**З ёй не трэба словамі крычаць,**
**Можна не хаваць самоту, слабасць,**
**І пра ўсё на свеце памаўчаць.**

**З ёй, нібыта песта, сярод ночы,**
**Можна слёзы ачышчэння ліць.**
**З кім яшчэ з людзей вось так захочаш**
**Насцеж усю душу адчыніць.**

**Адзінота... Хто цябе прыдумаў,**
**З космаса далёкага прыслаў...**
**Адзінота калыхае думы,**
**Зрэдку адрываючы ад спраў.**

**Ды затое, дорачы натхненне**
**На стварэнне новага ў жыцці,**
**Музыкі, карцін і разумення,**
**Як далей не падаць, а ісці.**

*30.07.2023*

***

**Трэба выпіць увесь да дна**
**Боль пакуты.**
**І застацца зусім адна**
**Ў нейкіх путах.**

**Трэба ўсіх даравяць, змагчы**
**Цераз сілу.**
**І масты для сябе злучыць**
**Над магілай.**

**Трэба моц мацаваць душы,**
**Ды і сэрца.**
**І сумленне не задушыць,**
**Не памерці.**

**Ёсць жыццё! І яно важней**
**За раскошу.**
**Хай згараць яны чым раней**
**Тыя грошы!**

**Ёсць жыццё і яно адно -**
**Дар вялікі.**
**Пераможа любое  дно**
**Мноствам блікаў.**

*12.12.2023*

